*А. Ю. КАЗЛЕНКА*

# БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ ВЫДАННІ АБ ПЕРСАНАЛІЯХ І КАЛЕКТЫВАХ: ПРАБЛЕМЫ ТЭРМІНАЛОГІІ

*На аснове аналізу прапанаваных спецыялістамі тэрмінаў, а таксама правіл логікі па азначэнні (логікі азначэння) паняццяў даецца тлумачэнне аўтарам паняцця “біябібліяграфічная інфармацыя” і разглядаецца мэтазгоднасць яго выкарыстання для азначэння ўсіх бібліяграфічных матэрыялаў аб персаналіях і калектывах.*

У тэорыі і практыцы бібліяграфічнай дзейнасці ў адносінах да бібліяграфічных выданняў, прысвечаных персаналіям і калектывам, не склалася ўстойлівая і уніфікаваная тэрміналагічная сістэма. Выкарыстоўваліся і выкарыстоўваюцца тэрміны “біябібліяграфія” (“біябібліяграфічная інфармацыя”), “персанальная бібліяграфія” (“персанальная бібліяграфічная інфармацыя”), “бібліяграфічная інфармацыя аб дзеячах (персаналіях)”, “персанальны аспект у бібліяграфіі” і інш. Аб разуменні пералічаных тэрмінаў, магчымасцях іх выкарыстання ў якасці сінонімаў існуе шмат супярэчлівых поглядаў.

Дадзеная праблема даследавалася такімі навукоўцамі, як А.М.Вяроўкіна, М.В.Здобнаў, А.С.Крымская, А.І.Коган, Н.М.Козачак, Л.С.Мандэльштам, І.І.Міхліна, Я.Я.Пейле, К.Р.Сімон, А.В.Цяпліцкая, А.Р.Фамін і інш. Пытанні тэрміналагічнага азначэння бібліяграфічных матэрыялаў аб персаналіях закранутыя таксама ў навуковых працах і вучэбных дапаможніках М.А.Брыскмана, А.П.Коршунава, Т.В.Кузьмініч, С.А.Трубнікава.

Тым не менш у працах беларускіх, расійскіх і іншых даследчыкаў, у нарматыўных дакументах не даецца стройная сістэма тэрміналогіі ў адносінах да бібліяграфічных матэрыялаў аб персаналіях, амаль не закранаюцца пытанні тэрміналагічнага азначэння бібліяграфічных матэрыялаў аб калектывах персаналій. Таму ў практыцы бібліяграфічнай дзейнасці аднатыпныя бібліяграфічныя выданні, прысвечаныя персаналіям, азначаюцца па-рознаму, што ўскладняе іх пошук і выкарыстанне.

Большасць азначэнняў тэрмінаў, якія адлюстроўваюць бібліяграфічныя матэрыялы аб персаналіях і калектывах, зводзяцца да пераліку структурных частак: біяграфічныя звесткі аб персаналіі (персаналіях), калектыве; бібліяграфічныя звесткі аб творах персаналіі (персаналій), калектыву і бібліяграфічныя звесткі аб літаратуры, прысвечанай персаналіі (персаналіям), калектыву [4; 12; 18; 21; 22]. Персанальная бібліяграфія ў большасці выпадкаў азначаецца як бібліяграфія адной персаналіі [13; 16; 17]. Асноўным адрозненнем біябібліяграфіі ад персанальнай бібліяграфіі становіцца або колькасць адлюстроўваемых персаналій, або наяўнасць біяграфічных звестак. Шмат у якіх крыніцах біябібліяграфія і персанальная бібліяграфія не выдзяляюцца як віды бібліяграфіі, а разглядаюцца толькі іх выданні [5; 6; 10]. Не даецца структура суадносін біябібліяграфіі і персанальнай бібліяграфіі, адсутнічае сістэматычнае жанравае або тыпалагічнае выдзяленне выданняў біябібліяграфічных або персанальных бібліяграфічных.

Недакладнасць у трактоўцы названых тэрмінаў звязана з адсутнасцю тэрміналагічнага азначэння паняцця, якое з’яўляецца радавым ў адносінах да ўсіх відаў бібліяграфічных матэрыялаў аб персаналіях і калектывах (яны могуць быць самымі разнастайнымі: аб адной або некалькіх персаналіях, калектыве; універсальныя; тэматычныя; тыя, што ўключаюць разнастайныя дакументы; тыя, што ўтрымліваюць або не ўтрымліваюць біяграфічныя звесткі аб персаналіі; калектыве; на друкаваных або электронных носьбітах інфармацыі і г.д.).

Не вызначана месца біябібліяграфіі (біябібліяграфічнай інфармацыі) у сістэме бібліяграфіі (бібліяграфічнай інфармацыі). Біябібліяграфія вызначаецца як від бібліяграфіі [3; 7; 11], як разнавіднасць біяграфічнага жанру [2; 14], як від бібліяграфіі і адначасова від даведачнай літаратуры [8].

Адной з праблем аднясення таго або іншага бібліяграфічнага выдання аб персаналіі (персаналіях), калектыве да ліку біябібліяграфічных з’яўляюцца суадносіны біяграфічнай і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічнай частак у выданні, а таксама ступень удзелу спецыялістаў-бібліёграфаў у падрыхтоўцы выдання.

Часцей за ўсё выданні аб персаналіях, якія ўтрымліваюць у сваёй структуры большую па аб’ёме біяграфічную частку, аўтаматычна адносяць да выданняў даведачных ці навуковых, навукова-папулярных (выданні тыпу “Хто ёсць хто”, “Установа ў асобах”, персанальныя энцыклапедыі, біяграфічныя слоўнікі і інш.). Традыцыйна прынята лічыць, што выданні аб персаналіях, створаныя спецыялістамі-бібліёграфамі, у біяграфічнай частцы не нясуць новай, атрыманай у выніку даследчай дзейнасці, інфармацыі (што не заўжды слушна) і таму адносяцца да выданняў біяграфічных. Атрымліваецца, што адно і тое ж выданне з практычна аднолькавымі па аб’ёме біяграфічнымі часткамі ў залежнасці ад аўтара-складальніка будзе аднесена або да навуковага (навукова-папулярнага), або да бібліяграфічнага.

Адсутнасць канкрэтных абмежаванняў непасрэдна для выданняў даведачных, навуковых (навукова-папулярных) і бібліяграфічных аб персаналіі (персаналіях), калектыве прыводзіць да страты значнага масіву інфармацыі ў пошукавых сістэмах. Напрыклад, да крыніц біяграфічнай інфармацыі не аднесены шэраг бібліяграфічных выданняў, якія ўтрымліваюць унікальную, новую біяграфічную інфармацыю аб персаналіях, што асабліва характэрна для матэрыялаў аб дзеячах краю, супрацоўніках устаноў.

Сёння няма і адназначнай трактоўкі паняццяў “бібліяграфія” і “бібліяграфічная інфармацыя”, вядуцца навуковыя спрэчкі аб мэтазгоднасці іх выкарыстання, прапануюцца замяшчальныя тэрміны, што, у сваю чаргу, уплывае на азначэнні бібліяграфічных матэрыялаў аб персаналіях і калектывах.

Аналізуючы ўзаемазвязанасць найбольш часта выкарыстоўваемых тэрмінаў “біябібліяграфія” і “персанальная бібліяграфія”, неабходна адзначыць, што ў самой назве “біябібліяграфія” не заключана інфармацыя аб яе частках. Хаця традыцыйна склалася так, што пры азначэнні крыніц біяграфічнай і бібліяграфічнай інфармацыі аб персаналіях выкарыстоўвалі паняцце “біябібліяграфія” менавіта з мэтай падкрэсліць наяўнасць гэтых дзвюх частак. Тым не менш прыстаўка “бія” (грэч. bios – жыццё) у складзе тэрміна “біябібліяграфія” не можа адназначна вызначацца як “біяграфія”. Лагічна дапусціць, што паняцце “біябібліяграфія” можна разумець як апісанне жыцця з дапамогай бібліяграфіі, шляхам прывядзення бібліяграфічных звестак аб творах персаналіі (персаналій), калектыву, літаратуры аб іх. Гэтае дапушчэнне можа зняць існуючыя ў навуковай літаратуры спрэчкі наконт наяўнасці або адсутнасці біяграфічных звестак у бібліяграфічных дапаможніках аб персаналіях, якія азначаюцца як “біябібліяграфія”, і наконт выбару абагульняючага для ўсіх бібліяграфічных матэрыялаў аб персаналіях і калектывах паняцця.

Тэрмін “персанальная бібліяграфія” традыцыйна разумее ў сваім змесце бібліяграфію персаналіі без выдзялення яе біяграфіі. У той жа час крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі аб многіх персаналіях (без выдзялення яўнай біяграфічнай часткі) не зусім карэктна азначаць як “персанальная бібліяграфія”. Сёння існуе тэндэнцыя азначаць падобныя выданні (паказальнікі (спісы) прац супрацоўнікаў калектыву, выданні тыпу “Установа ў асобах” і інш.) як галіновыя або шматгаліновыя. Але тут пры іх азначэнні не ўлічваецца асноўная мэта стварэння падобных выданняў – прадставіць біяграфію калектыву. Тэрмін “персанальная бібліяграфія” не можа з’яўляцца радавым у адносінах да ўсіх відаў бібліяграфічных матэрыялаў аб персаналіях і калектывах, таму што ён, як і адзначаецца многімі спецыялістамі, выключае ў сваім азначэнні адлюстраванне біяграфічнай інфармацыі і бібліяграфічнай інфармацыі аб калектывах, аб многіх персаналіях у адным выданні. Акрамя таго, існуючыя азначэнні паняцця “персанальная бібліяграфія” пакідаюць няясным пытанне, лічыць ці не спіс прац персаналіі (без спіса літаратуры аб ёй) персанальнай бібліяграфіяй, гэта значыць наколькі неабходны для азначэння персанальнай бібліяграфіі элемент “літаратура аб ёй”.

Вывучэнне прац сучасных аўтараў па пабудове класіфікацыйных сістэм і мадэлей прывяло нас да думкі аб пабудове эвалюцыйнай мадэлі біябібліяграфічнай інфармацыі, у якой знаходзяць месца ўсе памянёныя намі паняцці і адпаведныя ім выданні. Асноўным,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

радавым у адносінах да ўсіх відаў бібліяграфічных матэрыялаў аб персаналіях, калектывах мы абралі паняцце “біябібліяграфічная інфармацыя”.

Біябібліяграфічная інфармацыя можа выступаць як самастойнае выданне, так і ў якасці часткі любых даведачных, навуковых, навукова-папулярных выданняў аб персаналіях, калектывах.

Зыходзячы з аналізу прапанаваных спецыялістамі тэрмінаў і іх азначэнняў, а таксама правіл логікі азначэння паняццяў, можна даць наступнае азначэнне выкарыстоўваемаму намі як найбольш інфарматыўнаму паняццю “біябібліяграфічная інфармацыя”. За аснову азначэння мы ўзялі прымету адлюстравання (па аналогіі з іншымі відамі бібліяграфічнай інфармацыі: рэкамендацыйная, краязнаўчая, перспектыўная і інш.).

*Біябібліяграфічная інфармацыя – гэта від бібліяграфічнай інфармацыі, які мае сваім аб’ектам біяграфічныя і бібліяграфічныя звесткі аб персаналіі (персаналіях), калектыве.*

У біябібліяграфічнай інфармацыі ў розных суадносінах адлюстроўваюцца біяграфічныя звесткі аб персаналіі (персаналіях), калектыве і бібліяграфічныя звесткі аб іх творах і літаратуры аб іх. Біяграфічныя звесткі аб персаналіі (персаналіях), калектыве могуць быць пададзены: 1) у выглядзе яўных біяграфічных звестак (біяграфія, аўтабіяграфія, біяграфічны нарыс, храналагічны спіс дат жыцця і дзейнасці і інш.); 2) як бібліяграфічныя звесткі аб літаратуры, прысвечанай персаналіі (персаналіям), калектыву; 3) скрытай (латэнтнай) біяграфічнай інфармацыяй аб персаналіі (персаналіях), калектыве. Дадзенае палажэнне – існаванне біяграфічнай інфармацыі аб персаналіі (персаналіях), калектыве ў трох магчымых варыянтах у складзе біябібліяграфічнай інфармацыі – здымае недавер многіх даследчыкаў да тэрміна “біябібліяграфічная інфармацыя” менавіта з-за пытання наяўнасці або адсутнасці ў яго складзе яўнай біяграфічнай інфармацыі і да яго замены на тэрмін “персанальная бібліяграфічная інфармацыя”.

Неабходна адзначыць, што любое біябібліяграфічнае выданне змяшчае ў сабе скрытую біяграфічную інфармацыю, г.зн. біяграфічную інфармацыю аб персаналіях, да часу няяўную, непрыметную, але аб’ектыўна існуючую. Самі бібліяграфічныя звесткі аб творах персаналіі і літаратуры аб ёй нясуць у сабе біяграфічную інфармацыю: з бібліяграфічных апісанняў можна даведацца аб гадах актыўнай творчасці, тэматычнай накіраванасці прац, навуковых або творчых сувязях, прыналежнасці да ўстановы і інш. Такім чынам, у выніку выкарыстання біябібліяграфічнай інфармацыі, нават той, якая не ўключае яўную біяграфічную інфармацыю, мы атрымліваем латэнтныя, выверaныя веды аб жыцці і дзейнасці персаналіі (персаналій), калектыву.

Пры распрацоўцы праблем тэрміналогіі ў адносінах да бібліяграфічных матэрыялаў аб персаналіях і калектывах неабходна адзначыць такую унікальную якасць бібліяграфічнай інфармацыі, як уласцівасць цэнтраваць, інтэграваць іншыя віды інфармацыі. Гэтая якасць асабліва характэрная для біябібліяграфічнай інфармацыі, якая першапачаткова да блока бібліяграфічнай інфармацыі аб творах персаналіі (персаналій), калектыву і літаратуры аб іх прыцягнула блок інфармацыі біяграфічнай. Сучасная біябібліяграфічная інфармацыя аб’ядноўвае паўнатэкставую, графічную інфармацыю (для друкаваных выданняў), а таксама аўдыё- і відэаінфармацыю, новыя інтэрактыўныя тэхналогіі (магчымасць сувязі праз электронную пошту, форумы і інш.) для электронных выданняў.

Пад прапанаванае намі азначэнне біябібліяграфічнай інфармацыі падыходзіць шэраг бібліяграфічных выданняў, якія традыцыйна з біябібліяграфічнай інфармацыяй не звязаныя. Гэта тычыцца ў першую чаргу бібліяграфічных паказальнікаў прац супрацоўнікаў установы*. Аднясенне дадзеных паказальнікаў да ліку біябібліяграфічных можна тлумачыць наяўнасцю ў навуцы паняцця “прасапаграфія”, пад якім разумеецца жанр даследаванняў, дзе вывучаюцца масавыя крыніцы з мэтай стварэння на аснове статыстычнага аналізу іх інфармацыі дынамічных “калектыўных біяграфій” пэўных сацыяльных груп, страт пры магчымасці вывучэння біяграфій асобных індывідуумаў, якія ўтвараюць дадзеныя групы і страты [19, с. 95].

* Толькі некаторыя аўтары, такія як Г.К.Быстрова, М.П.Гастфер, Т.В.Захарчук, А.В.Цяпліцкая, лічаць дадзеныя паказальнікі біябібліяграфічнымі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, мы свядома пашыраем аб'ём паняцця "біябібліяграфічная інфармацыя" з мэтай шматаспектнага выкарыстання біябібліяграфічнай інфармацыі ў розных сферах дзейнасці адносна яе функцыянальнага патэнцыялу.

Да гэтага часу не складзена і дакладная сістэма тэрміналогіі ў адносінах да біябібліяграфічнай інфармацыі ў электронным выглядзе – баз даных, электронных выданняў, інтэрнет-рэсурсаў, дзе змяшчаюцца бібліяграфічныя звесткі аб творах персаналіі (персаналій), калектыву, літаратуры аб іх, а таксама біяграфічныя звесткі ў яўнай або скрытай форме.

Адзінкавыя даследаванні, што прысвечаны базам даных, якія ўтрымліваюць біяграфічную і бібліяграфічную інфармацыю аб персаналіях і калектывах, адлюстроўваюць толькі методыку іх стварэння і выкарыстання, але не закранаюць пытанні тэрміналогіі [1; 9; 20].

На аснове прапанаваных спецыялістамі азначэнняў і тэрміналагічных канструктаў, прынятых у дзейнасці па стварэнні электронных рэсурсаў, нам падаецца правамерным для азначэння біябібліяграфічнай інфармацыі, пададзенай у электроннай форме, выкарыстоўваць паняцце "электронная біябібліяграфічная інфармацыя". Яно ў поўнай меры адлюстроўвае як змястоўны склад інфармацыі, так і яе носьбіт.

У склад электроннай біябібліяграфічнай інфармацыі ўваходзяць: лакальныя базы даных, базы даных на CD-ROM/DVD-ROM, электронныя выданні на CD-ROM/DVD-ROM, старонкі Інтэрнета – усё адпаведнага зместу. Пры выбары такога паняцця не ўзнікае праблем з азначэннямі "персанальны" і "персаналізаваны" і іх тлумачэннем. Разнавіднасцю біябібліяграфічных баз даных з'яўляюцца базы даных аўтарытэтных запісаў, або аўтарытэтныя базы даных. У адносінах да гэтых рэсурсаў існуе вялікая колькасць публікацый, актыўная праца над тэарэтычным абгрунтаваннем і стварэннем баз даных аўтарытэтных запісаў вядзецца ў Рэспубліцы Беларусь.

Такім чынам, радавым паняццем у адносінах да ўсіх відаў бібліяграфічных матэрыялаў аб персаналіях і калектывах можа з'яўляцца паняцце "біябібліяграфічная інфармацыя". У біябібліяграфічнай інфармацыі ў розных суадносінах адлюстроўваюцца біяграфічныя звесткі аб персаналіі (персаналіях), калектыве, бібліяграфічныя звесткі аб іх творах і літаратуры аб іх. Разнастайнасць друкаваных і электронных выданняў, якія ўтрымліваюць біябібліяграфічную інфармацыю, можа быць пададзена ў выглядзе эвалюцыйнай мадэлі біябібліяграфічнай інфармацыі.

---


1. *Алешин, Л.И.* Электронные базы данных персоналий / Л.И.Алешин // Библиография. – 1999. – № 1. – С. 28–30.

2. *Беспалова, Э.К.* Биографический жанр в библиографии. Персоналия библиографов / Э.К.Беспалова. – М.: Моск. гос. ун-т культуры, 2003. – 212 с.

3. *Библиография:* общий курс: учеб. для библиотеч. фак. ин-тов искусств / под ред. М.А.Брискмана, А.Д.Эйхенгольца. – М.: Книга, 1969. – 560 с.

4. *Библиотечное* дело: терминолог. словарь / Рос. гос. б-ка. – М., 1997. – 167 с.

5. *ГОСТ 7.0-99* (ИСО 5127 – 1 – 83) Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения. – Взамен ГОСТ 7.0 – 84, ГОСТ 7.26 – 80; введ. 01.07.2000. – Мн.: Изд-во стандартов, 1999. – 23 с.

6. *ГОСТ 7.60-90* Издания. Основные виды. Термины и определения. – Взамен ГОСТ 16447 – 78; введ. 01.01.91. – М. : Изд-во стандартов, 1990. – 29 с.

7. *Гречихин, А.А.* Общая библиография. Теоретико-методологические основы: учеб. пособие / А. А.Гречихин. – М.: Моск. политехнический ин-т, 1990. – 108 с.

8. *Грузинова, Л.Б.* Иностранная библиография: конспект лекций / Л.Б.Грузинова; Моск. гос. акад. печати. – М.: Рос. гос. б-ка, 1995. – 63 с.

9. *Диковская, Е.А.* Базы данных персоналий / Е.А.Диковская // А.С.Пушкин и современная отечественная культура: тез. докл. – Самара: Самарская гос. акад. культуры и искусств, 2000. – С. 39–40.

10. *Книговедение:* энциклопед словарь. – М.: Сов. энциклопедия, 1982. – 664 с.

11. *Коршунов, О.П.* Библиография. Теория, методология, методика / О.П.Коршунов. – М.: Книга, 1986. – 288 с.

12. *Кричевский, Г.Г.* Биобиблиография / Г.Г.Кричевский // БСЭ. – 3-е изд. – М.: Сов. энциклопедия, 1970. – Т. 3. – С. 326.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. *Кузьмініч, Т.В.* Інфармацыйная культура асобы: вучэб. дап. / Т.В.Кузьмініч. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры, 2002. – 168 с.
14. *Лявончыкаў, В.Е.* Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў / В.Е.Лявончыкаў, Л.А.Дзямешка, Р.І.Саматыя. – Мн.: Бел. ун-т культуры, 2000. – 225 с.
15. *Потепалова, Н.С.* Персонологический аспект региональной литературной библиографии Среднего Поволжья [Электронный ресурс]: дис. … канд. пед. наук: 05.25.03 / Н.В.Потепалова. – Электрон. данные. – Режим доступа: http://diss.rsl.ru/diss/03/0045/030045045.pdf. – Загл. с экрана.
16. *Ситник, С.М.* БД собственной генерации отдела справочно-информационной работы Центральной научной библиотеки НАН Беларуси / С.М.Ситник, Н.Г.Комарова // Информационные технологии и электронные ресурсы в библиографической работе: материалы семинара. – Мн.: Центр. б-ка им. Я.Купалы, 2004. – С. 14–19.
17. *Терминологический* словарь по библиотечному делу и смежным отраслям знания. – М.: Биб-ка естеств. наук, 1995. – 268 с.
18. *Шамурин, Е.И.* Словарь книговедческих терминов для библиотекарей, библиографов, работников печати и книжной торговли / Е.И.Шамурин. – М.: Сов. Россия, 1958. – 340 с.
19. *Юмашева, Ю.Ю.* Историография просопографии / Ю.Ю.Юмашева // Известия Уральского государственного университета. – 2005. – № 39. – С. 95–127.
20. *Яцкевич, А.Н.* Научный мир Беларуси: базы данных / А.Н.Яцкевич // Мир библиографии. – 2002. – № 5. – С. 37–38.
21. *Harrod's* Librarians' Glossary & Reference Book. – 9-th ed. – Ashgate Publishing, 1999. – 808 p.
22. *Kabrt, J.* Slovnik teorie a metodiki bibliographie / J.Kabrt. – Praga, 1982. – 63 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ